У. Е. Снапкоўскі,
доктар гістарычных навук,
прафесар

## Тэндэнцыі станаўлення інстытута палітычнага лідэрства ў Беларусі

Пры савецка-камуністычнай сістэме палітычнае лідэрства мела выразна-этатысцкі характар і фактычна атаясамлівалася з выкананнем функцый па кіраванню дзяржавай. Ва ўмовах таталітарызму палітычнага лідэрства як спецыфічнага інстытута ўлады не існавала. Замест яго панавала правадырства (вождизм), тып уладарных адносін, заснаваны па асабістай адданасці правадыру, які валодаў вярхоўнай уладай. Правадырства і сакралізацыя органаў кіравання сфармавалі аўтарытарна-правадырскі тып свядомасці савецкіх грамадзян.

Пераход ад таталітарнага да дэмакратычнага грамадства вядзе да трансфармацыі правадырства ў інстытут грамадска-палітычнага лідэрства. Станаўленне гэтага інстытута ў апошняе дзесяцігоддзе развіцця Беларусі прайшло тры этапы.

Першы этап (этап легітымізацыі палітычных лідэраў) ахоплівае гады гарбачоўскай перабудовы. Монацэнтрысцкая сістэма лідэрства, заснаваная на ўсеўладдзі КПСС, паступова змяняецца поліцэнтрысцкай, для якой характэрна з'яўленне «палітычнага рынку», дзе спаборнічаюць паміж сабой старыя і новыя лідэры. Адной крыніцай папаўнення палітычных лідэраў была камуністычная наменклатура, якая мела ў Беларусі моцныя карані і шырокую падтрымку. На рубяжы 80 - 90-х гадоў шэрагі такіх публічных палітыкаў папоўнілі М. Дземянцей, П. Краўчанка, В. Кебіч, А. Малафееў і інш. Другой асноўнай крыніцай фарміравання грамадскіх і палітычных лідэраў з'явіліся нефармальныя грамадскія аб'яднанні, якія аб'ядналіся затым на платформе Беларускага Народнага Фронту. Сацыяльнай базай гэтай групы лідэраў была гарадская інтэлігенцыя, а яе найбольш вядомымі прадстаўнікамі з'явіліся З. Пазняк, С. Шушкевіч, М.Ткачоў і інш. Моцна і аўтарытэтна гучалі ў гэты час галасы прадстаўнікоў творчай і навуковай эліты: А. Адамовіча, В. Быкава, Н. Гілевіча і інш.

У апошнія гады перабудовы, што супалі па часе з дэзінтэграцыяй СССР, у асяроддзі беларускіх грамадска-

палітычных лідэраў выявіўся водападзел паміж прадстаўнікамі былой камуністычнай і гаспадарчай наменклатуры, з аднаго боку, і нацыянальна-дэмакратычных колаў грамадства, - з другога. Зразумела, што такое дзяленне не адлюстроўвае дакладна ўсяго спектра інстытута палітычнага лідэрства, што фармаваўся ў Беларусі, але яно дазваляе выдзеліць дзве галоўныя супрацьлеглыя групоўкі лідэраў, якія вялі і вядуць палітычную барацьбу за ўладу, за розум і сэрцы беларускіх грамадзян.

Другі этап станаўлення палітычнага лідэрства ў нашай краіне, які можна назваць этапам умацавання, кансалідацыі лідэраў, ахоплівае гады існавання парламенцкай рэспублікі (1990 - 1994 гг.). У гэтыя часы лідэры прйшлі праз такія вострыя, рэвалюцыйныя калізіі, як зараджэнне шматпартыйнай сістэмы і ліквідацыі палітычнай манаполіі КПСС на ўладу, жнівеньскі путч, распад СССР, фарміраванне новых незалежных дзяржаў, пачатак рыначных рэформ.

Распад СССР і набыцце Беларуссю ўласнай дзяржаўнасці з'явіліся вызначальнай лініяй водападзелу паміж грамадска-палітычнымі лідэрамі і элітай Беларусі. Яны падзяляюцца на прыхільнікаў аднаўлення Саюза, інтэрнацыяналістаў, з аднаго боку, і прыхільнікаў беларускай дзяржаўнасці, незалежнікаў, - з другога. Другой лініяй расколу паміж лідэрамі і элітай, як і ўсяго беларускага грамадства, з'яўляюцца адносіны да дэмакратычных і рыначных рэформ. У адпаведнасці з гэтай лініяй лідэры ўмоўна падзяляліся на камуністаў, бюракратаў, што выступаюць за рыначны сацыялізм, і дэмакратаў, што выступаюць за глыбокую сістэмную трансфармацыю грамадства. Паколькі радыкальных сацыяльна-эканамічных рэформ у Беларусі не праводзілася, а таксама ў выніку дзеяння шэрагу іншых аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын, грамадска-палітычная барацьба вакол пытання аб лесе і перспектывах нацыянальнай дзяржаўнасці вялася значна больш востра і напружана, чым вакол рыначных і дэмакратычных рэформ.

У гэты перыяд фарміраванне і крышталізацыя палітычных лідэраў адбываліся ў рамках парламенцка-палітычнай сістэмы. Фармальныя лідэры ці лідэры ў выніку сваей пасады (С.Шушкевіч, В.Кебіч) былі адначасова і самымі папулярнымі і прызнанымі публічнымі палітыкамі. Трэцяе месца па папулярнасці займаў З.Пазняк. У асяроддзі фракцыі БНФ Вярхоўнага Савета 12 склікання склалася яркае сузор'е палітычных лідэраў нацыянальна-

дэмакратычнага накірунку. Важную роль ў працэсе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і дэмакратычнага развіцця Беларусі адыграў старшыня Вярхоўнага Савета С.Шушкевіч. Але ўмацаванне пазіцыі «партыі ўлады» на чале з прэм'ер-міністрам В.Кебічам у парламенце і вакол яго разам з актывізацыяй прыхільнікаў беларуска-расійскага яднання прывялі да адстаўкі С.Шушкевіча і аслаблення групоўкі нацыянальна-дэмакратычных лідэраў. Перамога на прэзідэнскіх выбарах 1994 г. А.Лукашэнкі азначала не толькі канец парламенцкай рэспублікі і паражэнне ўсіх «старых» палітыкаў (В.Кебіча, З.Пазняка, С.Шушкевіча), але і канец этапу сістэмнай апазіцыі ў парламенце і дэмакратычнаму працэсу фарміравання палітчных лідэраў.

Пасля абрання першага прэзідэнта ў 1994 г. пачынаецца трэці этап станаўлення інстытута палітычнага лідэрства ў Беларусі. Яго ўмоўна можна назваць этапам правадырства. У гэты час адбываецца ўзмацненне інстытута прэзідэнства і асабістай ўлады А.Лукашэнкі, асабліва пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 г. і ўвядзення ў дзеянне новай рэдакцыі Канстытуцыі РБ. Намаганні кіраўніка дзяржавы і ўсей выканаўчай улады накіроўваюцца на ўсталяванне прамой сувязі паміж прэзідэнтам і народам. Такія перадатачныя механізмы палітычнага працэсу, як дэмакратычна абраны парламент, палітычныя партыі, незалежныя прафсаюзы, недзяржаўныя грамадскія аб'яднанні, незалежныя СМІ выціскаюцца з палітычнай арэны і ператвараюцца ў несістэмную апазіцыю.

Пасля рэформы мясцовага кіравання ў кастрычніку 1994 г. пачынаецца фарміраванне інстытута палітычнага лідэрства на абласным, гарадскім і раенным ўзроўні, прэзідэнская вертыкаль становіцца галоўным сродкам рэалізацыі ўнутранай палітыкі А.Лукашэнкі. Асноўным прынцыпам кадравай палітыкі з'яўляецца лаяльнасць і адданасць прэзідэнту, у выніку чаго спыняецца працэс цыркуляцыі эліт і аднаўлення кіруючай наменклатуры.

Другі цэнтр палітычнага лідэрства фарміруецца вакол дэпутатаў Вярхоўнага Савета 13 склікання на чале з яго старшынёй І.Шарэцкім. Ен аб'ядноўвае апазіцыйныя прэзідэнту грамадска-палітычныя сілы, якія выступаюць за аднаўленне Канстытуцыі 1994 г., сбалансаваны падзел уладаў, дэмакратычныя і рыначныя рэформы, правядзенне знешняй палітыкі ў адпаведнасці з беларускімі дзяржаўнымі інтарэсамі. У рамках апазіцыі створаны ценявы ўрад, які распрацаваў альтэрнатыўныя прэзідэнцкай уладзе

канцэпцыі дзяржаўнага будаўніцтва, унутранай і знешняй палітыкі. Недахопам апазіцыі з'яўляецца адсутнасць ярка выражанага агульнанацыянальнага лідэра, які змог бы супрацьстаяць дзеючаму прэзідэнту. Разумеючы гэта, апазіцыя прыкладае намаганні па вылучэнню такой постаці, тым больш, што прэзідэнскія выбары 1999 г. не за гарамі.

Асаблівасцямі трэцяга этапу станаўлення палітычнага лідэрства ў Беларусі з'яўляюцца і такія арыгінальныя з'явы, як палітычная эміграцыя лідэраў БНФ З.Пазняка, С.Навумчыка і існаванне двух парламентаў: Нацыянальнага Сходу РБ, прызначанага Прэзідэнтам, і Вярхоўнага Савета РБ, абранага ў 1995 г. Непрызнанне вынікаў лістападаўскага рэферэндуму з боку сусветнага супольніцтва парадзіла праблему непрызнання прэзідэнскага парламенту. Адначасова ўплывовыя міжнародныя арганізацыі (АБСЕ, Савет Еўропы, Еўрапейскі Саюз і інш.), заходнія дзяржавы прызнаюць легітымнасць Вярхоўнага Савета і запрашаюць яго прадстаўнікоу на сваі пасяджэнні. Несумненна, што знешні фактар у выніку асобнага геапалітычнага становішча Беларусі можа адыграць вырашальную ролю ў развіцці палітычнага працэса ў краіне, урэгуляванні канстытуцыйна-палітычнага крызісу і станаўленні інстытута палітычнага лідэратсва на асновах дэмакратыі, прапарцыянальнага падзелу ўладаў і прававой дзяржавы.

Нягледзячы на значныя адхіленні ў станаўленні інстытута палітычнага лідэрства ў нашай дзяржаве ў бок аўтарытарнага праваўдырства, што з'яўляецца вынікам падданіцкай культуры мас, гэты інстытут можа адыграць сваю станоўчую ролю артыкуляцыі і крышталізацыі інтарэсаў грамадства, сацыяльных груповак, палітычных партый і эліт. З'яўленне на палітычнай авансцэне Беларусі яркіх лідэраў разнастайнай арыентацыі, іх кансалідацыі на глебе дэмакратыі і нацыянальных інтарэсаў беларускага народа будзе садзейнічаць устойліваму развіццю дзяржавы і яе сацыяльна-палітычнай стабільнасці.